Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар універсітэта
Н.У.Карчэўская
23.09.2022

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ “БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА”

**спецыяльнасці перападрыхтоўкі**
**2-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія**

Мінск, 2022

Складальнік:
*Барма А.А., старшы выкладчык кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, магістр педагагічных навук*

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:
*Кафедрай культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін*
*(пратакол ад 07.09.2022 № 36);*

*Саветам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў*
*(пратакол ад 22.09.2022 № 8 ).*

# ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| 1 | ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА | 4 |
| 2 | ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 6 |
| | Хрэстаматыйны матэрыял | 6 |
| 3 | ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 29 |
| | Пытанні для правядзення круглых сталоў | 29 |
| 4 | РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ | 30 |
| 4.1 | Заданні для арганізацыі самастойнай работы слухачоў | 30 |
| 4.2 | Пытанні для правядзення заліку па вучэбнай дысцыпліне | 32 |
| 5 | ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ | 34 |
| 5.1 | Вучэбная праграма | 34 |
| 5.2 | Спіс літаратуры | 48 |
| 5.3 | Відэаматэрыялы па вучэбнай дысцыпліне | 50 |
| 5.4 | Прафесійныя электронныя інфармацыйныя рэсурсы адкрытага доступу па вучэбнай дысцыпліне | 52 |

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Бібліятэказнаўства – навуковая дысцыпліна, якая вывучае тэорыю, гісторыю, метадалогію, тэхналогію, методыку і арганізацыю бібліятэчнай справы, а таксама прынцыпы фарміравання, развіцця, функцыянавання бібліятэчнай сістэмы. У тэарэтычным плане бібліятэказнаўства вывучае заканамернасці і прынцыпы фарміравання бібліятэк і бібліятэчных сістэм, місію, задачы, сацыяльную ролю і сацыяльныя функцыі бібліятэк; у гістарычным – заканамернасці ўзнікнення, развіцця і ўдасканалення бібліятэк і бібліятэчных сістэм; у арганізацыйным – навукова абгрунтоўвае рацыянальную сістэму функцыянавання бібліятэчнай справы ў краіне, распрацоўвае прынцыпы стварэння і развіцця бібліятэчнай сістэмы, шляхі і сродкі арганізацыі працы і кіравання ў галіне бібліятэчнай справы; у метадычным – распрацоўвае метады, спосабы, прыёмы, якія прымяняюцца ў бібліятэчнай справе; вывучае іх эфектыўнасць; садзейнічае ўкараненню навін (інавацый) у бібліятэчную практыку.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Бібліятэказнаўства” накіравана на асваенне слухачамі тэарэтычных канцэпцый, якія даюць цэласнае ўяўленне пра бібліятэчную справу і заканамернасці яе развіцця, прадстаўляюць у сваёй сукупнасці навукова-метадычную базу для аналізу, ацэнкі і абагульнення з'яў і працэсаў бібліятэчнай практыкі ў мэтах яе ўдасканалення і развіцця.

Дадзеныя метадычныя рэкамендацыі прадстаўляюць сабой сістэму дыдактычных сродкаў навучання па вучэбнай дысцыпліне. Структурна-лагічная мадэль выкладання вучэбнага матэрыялу спрыяе фармаванню ў слухачоў прафесійных кампетэнцый, накіраваных на выкананне імі сваіх функцый у бібліятэках розных тыпаў і відаў, а таксама разуменню заканамернасцей і перспектыщ развіцця бібліятэчнай справы ў кантэксце сучасных сацыякультурных, эканамічных, палітычных, грамадскіх трансфармацый.

Мэта метадычных рэкамендацый – сістэматызацыя вучэбна-метадычных матэрыялаў, якія адлюстроўваюць розныя падыходы да вывучэння сістэм функцыянавання бібліятэчнай справы ў краіне і іх засваенне кіруючымі работнікамі і спецыялістамі бібліятэчнай справы Рэспублікі Беларусь, слухачамі спецыяльнасці перападрыхтоўкі “2-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія”.

Задачы метадычных рэкамендацый:

сістэматызацыя навуковай, навукова-практычнай, метадычнай, нарматыўна-прававой інфармацыі, якая адлюстроўвае праблемнае поле вучэбнай дысцыпліны;

упарадкаванне працэсу вывучэння вучэбнай дысцыпліны з улікам патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да вучэбных заняткаў (арганізацыя, правядзенне, інфармацыйна-метадычнае суправаджэнне; прымяненне метадаў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці слухачоў);

забеспячэнне арганізацыі самастойнай вучэбнай працы і кантролю ведаў слухачоў;

аказанне слухачам метадычнай дапамогі ў засваенні вучэбнага матэрыялу;

аказанне выкладчыкам метадычнай дапамогі, неабходнай для арганізацыі адукацыйнага працэсу па дадзенай вучэбнай дысцыпліне на высокім навукова-метадычным узроўні.

*У тэарэтычным раздзеле* прадстаўленых метадычных рэкамендацый змяшчаюцца QR-коды на хрэстаматыйны матэрыял, які адлюстроўвае тэарэтычныя і фактычныя матэрыялы па тэмах вучэбнай дысцыпліны.

*Практычны раздзел* уключае тэматыку круглага стала.

*У раздзеле кантролю ведаў* прадстаўлена тэматыка заданняў для самастойнай працы слухачоў.

Пытанні да заліку сфармуляваны ў адпаведнасці са змястоўным кампанентам вучэбнай праграмы. Пры атэстацыі ўлічваюцца вынікі выканання заданняў, якія выносяцца выкладчыкам на самастойную працу слухачоў.

*Дапаможны раздзел* метадычных рэкамендацый уключае вучэбную праграму, пералік вучэбных выданняў і інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў, якія рэкамендуюцца для вывучэння па вучэбнай дысцыпліне (спіс асноўнай і дадатковай літаратуры).

Для павышэння эфектыўнасці вывучэння вучэбнай дысцыпліны рэкамендуецца выкарыстоўваць педагагічныя тэхналогіі для актывізацыі разумовай дзейнасці слухачоў (праблемнае навучанне, гульнявыя тэхналогіі), для эфектыўнасці кіравання і арганізацыі навучальнага працэсу – індывідуалізацыю навучання, тэхналогіі паэтапнага фарміравання разумовых дзеянняў, вучэбна-даследчай дзейнасці, калектыўныя і групавыя спосабы навучання.

Для вывучэння дысцыпліны «Бібліятэказнаўства» прадугледжана 30 вучэбных гадзін, якія ўключаюць 14 вучэбных гадзін аўдыторных заняткаў (з іх: 12 вучэбных гадзін – лекцыі, 2 вучэбныя гадзіны – круглы стол); 16 вучэбных гадзін – самастойная праца слухачоў.

Рэкамендуемай формай кантролю ведаў слухачоў з'яўляецца залік.

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

***Хрэстаматыйны матэрыял***

## Раздзел 1 Тэарэтычныя асновы бібліятэказнаўства

### Тэма 1.1 Сутнасць, функцыі і структура бібліятэказнаўства

План лекцыі:

1. Дэфініцыя паняцця “бібліятэказнаўства” ў навуковым дыскурсе.
2. Заканамернасці развіцця і асноўныя задачы бібліятэказнаўства.
3. Аб’ект і прадмет бібліятэказнаўства.
4. Структура бібліятэказнаўства як навукі і дысцыпліны.

*Хрэстаматыйны матэрыял*

Библиотековедение. Теория [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, фак. информационно-документных коммуникаций, каф. теории и истории информационно-документных коммуникаций ; сост. Ж. Л. Романова. – Минск, 2018. – 67 с.

*Кантрольныя пытанні па тэме*

1. Якія дэфініцыі паняцця “Бібліятэказнаўства” прапануюць вучоныя і практыкі бібліятэчнай справы?
2. Якія заканамернасці развіцця бібліятэказнаўства вылучаюць вучоныя?
3. Што з'яўляецца аб'ектам і прадметам бібліятэказнаўства?

## Тэма 1.2 Бібліятэказнаўства ў сістэме навук

План лекцыі:

1. Месца бібліятэказнаўства ў сістэме навук.
2. Статус бібліятэказнаўства ў сістэме навуковых ведаў.
3. Бібліятэказнаўства і дысцыпліны кнігазнаўчага, дакументазнаўчага, бібліяграфазнаўчага і інфармацыйнага цыклаў.
4. Сувязі бібліятэказнаўства з філасофіяй, сацыялогіяй, псіхалогіяй, педагогікай, эканомікай, менеджментам, культуралогіяй і іншымі навукамі.

*Хрэстаматыйны матэрыял*

Столяров, Ю. Н. Электронное библиотековедение: сущность, дефиниция / Ю. Н. Столяров // Науч. и техн. биб-ки. – 2021. – № 7. – С. 13–32.

Вохрышева, М. Г. Библиотековедение, библиографоведение, книговедение: синтез научного знания / М. Г. Вохрышева // Потенциал библиотеки в современном мире: трансформации, перспективы : Материалы Всерос. науч.-практ. конф. с междунар. участием, Самара, 25 мая 2021 г. – Самара: СГИК, 2021. – С. 35–43.

Вихрева, Г. М. Новая библиотечная философия: векторы формирования / Г. М.Вихрева // Вестник Кемеровского гос. ун-та культуры и искусств. – 2017. – № 40.

*Кантрольныя пытанні па тэме*

1. Якое месца займае бібліятэказнаўства ў сістэме навук?
2. Якім чынам вызначаецца статус бібліятэказнаўства ў сістэме навуковых ведаў?
3. Што бібліятэказнаўства звязвае з філасофіяй, сацыялогіяй, псіхалогіяй, педагогікай, эканомікай, менеджментам і культуралогіяй?

## Раздзел 2 Асновы вучэння аб бібліятэцы

## Тэма 2.1 Генезіс і сутнасць бібліятэкі як сацыяльнага інстытута

План лекцыі:

1. Бібліятэка як грамадская ўстанова.
2. Узнікненне і развіццё бібліятэкі як асобнага сацыяльнага інстытута.
3. Сацыяльная роля бібліятэкі, яе грамадскае прызначэнне.
4. Месца і роля бібліятэкі сярод іншых сацыяльных інстытутаў.

*Хрэстаматыйны матэрыял*

Библиотековедение. Теория [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, фак. информационно-документных коммуникаций, каф. теории и истории информационно-документных коммуникаций ; сост. Ж. Л. Романова. – Минск, 2018. – 67 с.

*Кантрольныя пытанні па тэме*

1. Бібліятэка як грамадская ўстанова.
2. Узнікненне і развіццё бібліятэкі як асобнага сацыяльнага інстытута.
3. Сацыяльная роля бібліятэкі, яе грамадскае прызначэнне.
4. Месца і роля бібліятэкі сярод іншых сацыяльных інстытутаў.

## Тэма 2.2 Прынцыпы і фунцыі дзейнасці бібліятэк

План лекцыі:

1. Эвалюцыя поглядаў на прынцыпы дзейнасці бібліятэк.
2. Каштоўнасныя дэтэрмінанты тэорыі прынцыпаў дзейнасці бібліятэк.
3. Эвалюцыя поглядаў на функцыі бібліятэк. Характарыстыка падыходаў да вызначэння функцый бібліятэк у розныя гістарычныя перыяды.
4. Асноўныя групы функцый. Сутнасныя сацыяльныя функцыі, іх асноўныя рысы. Кумулятыўная, мемарыяльная і камунікатыўная функцыі бібліятэк, іх характарыстыка, узаемасувязі, супярэчнасці.

*Хрэстаматыйны матэрыял*

Библиотековедение. Теория [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, фак. информационно-документных коммуникаций, каф. теории и истории информационно-документных коммуникаций ; сост. Ж. Л. Романова. – Минск, 2018. – 67 с.

Гендина, Н. И. Изменение функций библиотек в эпоху социокультурных трансформаций: социальные риски и проблема выбора ориентиров / Н. И. Гендина, Л. Н. Рябцева // Библиотековедение. – 2018. – Т. 67. – № 3. – С. 257–265.

*Кантрольныя пытанні па тэме*

1. Эвалюцыя поглядаў на прынцыпы дзейнасці бібліятэк.
2. Эвалюцыя поглядаў на функцыі бібліятэк.
3. Характарыстыка падыходаў да вызначэння функцый бібліятэк у розныя гістарычныя перыяды.
4. Сутнасныя сацыяльныя функцыі, іх асноўныя рысы.
5. Кумулятыўная, мемарыяльная і камунікатыўная функцыі бібліятэк, іх характарыстыка, узаемасувязі, супярэчнасці.

## Тэма 2.3 Бібліятэка як сістэма

План лекцыі:

1. Выкарыстанне сістэмнага падыходу да вывучэння бібліятэчнай справы.
2. Паняцці “сістэма”, “падсістэма”, “элемент”.
3. Чатырохэлементная мадэль бібліятэкі Ю. Сталярова. Бібліятэка як шматконтурная сістэма.
4. Характарыстыка падсістэм бібліятэкі, вызначэнне іх унутраных і знешніх функцый, сістэмаўтваральных элементаў.

*Хрэстаматыйны матэрыял*

Библиотековедение. Теория [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, фак. информационно-документных коммуникаций, каф. теории и истории информационно-документных коммуникаций ; сост. Ж. Л. Романова. – Минск, 2018. – 67 с.

*Кантрольныя пытанні па тэме*

1. Якім чынам выкарыстоўваецца сістэмны падыход да вывучэння бібліятэчнай справы?
2. Што такое “сістэма”, “падсістэма”, “элемент”?
3. Назавіце элементы чатырохэлементнай мадэлі бібліятэкі (па Ю. Сталярову).
4. Назавіце асноўныя характарыстыкі падсістэм бібліятэкі, іх унутраныя і знешнія функцыі?

## Тэма 3.1 Агульная характарыстыка бібліятэчнай справы

План лекцыі:

1. Сутнасна-функцыянальная структура бібліятэчнай справы.
2. Асноўныя прынцыпы арганізацыі бібліятэчнай справы.
3. Асноўныя прынцыпы арганізацыі бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь.

*Хрэстаматыйны матэрыял*

Библиотековедение. Теория [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, фак. информационно-документных коммуникаций, каф. теории и истории информационно-документных коммуникаций ; сост. Ж. Л. Романова. – Минск, 2018. – 67 с.

Становление и развитие библиотек Беларуси: архивные документы [проект Национальной библиотеки Беларуси]

Обзор деятельности библиотек системы Министерства культуры Республики Беларусь [Национальная библиотека Беларуси]

*Кантрольныя пытанні па тэме*

1. Назавіце сутнасна-функцыянальныя структуры бібліятэчнай справы.
2. Назавіце асноўныя прынцыпы арганізацыі бібліятэчнай справы ў СНД.
3. Назавіце асноўныя прынцыпы арганізацыі бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь.

# 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## *Пытанні для правядзення круглых сталоў*

### К р у г л ы  с т о л

**Тэма 3.2 Бібліятэчныя сеткі і сістэмы** (2 гадзіны)

***Сістэма бібліятэк Рэспублікі Беларусь.***

*Мэта*: замацаваць тэарэтычныя веды, якія датычацца арганізацыі сістэмы бібліятэк Рэспублікі Беларусь.

*Задачы*:

ажыццявіць агульную характарыстыку сістэмы бібліятэк Рэспублікі Беларусь;

разгледзець сеткі бібліятэк Беларусі і іх каардынацыйныя і метадычныя цэнтры.

*Парадак узаемадзеяння*:

1. Адкрыццё круглага стала.
2. Прэзентацыя тэмы, мэты і задач круглага стала.
3. Прэзентацыя пытанняў круглага стала.
4. Абмеркаванне пытанняў круглага стала.
5. Абагульненне вынікаў круглага стала.

*Пытанні для абмеркавання:*

1. Агульная характарыстыка сістэмы бібліятэк Беларусі.
2. Нацыянальная бібліятэка Беларусі – галоўная бібліятэка краіны, яе тыпалагічныя асаблівасці і функцыі.
3. Сеткі бібліятэк і іх каардынацыйныя і метадычныя цэнтры.

# 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## *4.1 Заданні для арганізацыі самастойнай работы слухачоў*

**Раздзел 2 Асновы вучэння аб бібліятэцы**

**Тэма 2.3 Бібліятэка як сістэма**

*Заданне* (4 гадзіны)

Знайсці адказы з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры на наступныя пытанні:

1. Характарыстыка падсістэм бібліятэкі.
2. Узаемасувязі паміж элементамі і падсістэмамі бібліятэкі.

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [1, с. 9–19; 3, с. 8–25].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.* Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанні № 12, 13).

**Тэма 2.4 Класіфікацыя і тыпалагізацыя бібліятэк**

*Заданне* (4 гадзін)

Знайсці адказы з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры на наступныя пытанні:

1. Распрацоўка праблемы тыпалогіі бібліятэк у бібліятэказнаўстве.
2. Сістэма крытэрыяў тыпалагізацыі бібліятэк.

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [6, с. 18–29; 7, с. 107–112].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.* Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанні № 16, 17).

**Раздзел 3 Бібліятэчная справа як галіна дзейнасці**

**Тэма 3.2 Бібліятэчныя сеткі і сістэмы**

*Заданне* (4 гадзіны)

Падрыхтаваць адказы з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры на наступныя пытанні:

1. Агульная характарыстыка сістэмы бібліятэк Беларусі.
2. Сеткі бібліятэк і іх каардынацыйныя і метадычныя цэнтры.

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [8, с. 20–35; 9, с. 169–172].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.* Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанні № 22, 24, 27, 28).

*Заданне* (4 гадзіны)

Падрыхтаваць адказы з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры на наступныя пытанні:

1. Асаблівасці дзейнасці нацыянальных бібліятэк.

2. Віды, тыпалагічныя функцыі нацыянальных бібліятэк.

3. Нацыянальная бібліятэка Беларусі – галоўная бібліятэка краіны, яе тыпалагічныя асаблівасці і функцыі.

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [5, с. 88–95; 11].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.* Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанне № 29).

## 4.2 Пытанні для правядзення заліку па вучэбнай дысцыпліне

1. Сутнасць бібліятэказнаўства, мэты, задачы и функцыі.
2. Аб’ект і прадмет бібліятэказнаўства.
3. Структура бібліятэказнаўства як навукі, навуковай дысцыпліны.
4. Эвалюцыя поглядаў на месца бібліятэказнаўства ў сістэме навук.
5. Месца бібліятэказнаўства ў сістэме навук.
6. Генезіс і сутнасць бібліятэкі.
7. Эвалюцыя поглядаў на прынцыпы дзейнасці бібліятэк.
8. Прынцыпы дзейнасці бібліятэк Беларусі.
9. Сутнасныя сацыяльныя функцыі бібліятэк, іх асноўныя рысы.
10. Прыкладныя сацыяльныя функцыі бібліятэк, іх асноўныя рысы.
11. Эвалюцыя поглядаў на бібліятэку як сістэму.
12. Чатырохэлементная мадэль бібліятэкі Ю. Сталярова.
13. Узаемасувязі паміж элементамі і падсістэмамі бібліятэкі.
14. Класіфікацыя бібліятэк у залежнасці ад іх сацыяльнага прызначэння, заснавальнікаў, форм уласнасці, статуса, фонду, карыстальнікаў і іншых прыкмет.
15. Тыпалогія як агульнатэарэтычная праблема бібліятэказнаўства.
16. Распрацоўка праблемы тыпалогіі бібліятэк у бібліятэказнаўстве.
17. Сістэма крытэрыяў тыпалагізацыі бібліятэк.
18. Віды і характэрныя асаблівасці публічных бібліятэк.
19. Віды і характэрныя асаблівасці спецыяльных бібліятэк.
20. Паняцце аб бібліятэчнай справе, яе мэты і задачы.
21. Асноўныя прынцыпы арганізацыі бібліятэчнай справы.
22. Агульная характарыстыка сістэмы бібліятэк Рэспублікі Беларусь.
23. Асаблівасці дзейнасці нацыянальных бібліятэк.
24. Віды, тыпалагічныя функцыі нацыянальных бібліятэк.
25. Нацыянальная бібліятэка Беларусі – галоўная бібліятэка краіны.
26. Абласныя бібліятэкі – буйныя рэгіянальныя цэнтры арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва.
27. Цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы.
28. Мэты, задачы, структура цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм.
29. Сетка навуковых бібліятэк Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.
30. Сетка бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў.
31. Задачы і функцыі сеткі бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў.
32. Сетка навукова-тэхнічных бібліятэк.
33. Задачы і функцыі сеткі навукова-тэхнічных бібліятэк.
34. Задачы і функцыі сеткі медыцынскіх бібліятэк.
35. Сетка медыцынскіх бібліятэк.

## 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

### 5.1 Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар універсітэта
Н.У.Карчэўская
.    .2022
Рэг. № ВД-___ Пп/эвуч.

**ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ**

**БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА**

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
2-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія,
кваліфікацыя: бібліятэкар-бібліёграф,
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
ад 28.09.2020 № 260, рэг. № 25-13/126

Мінск, 2022

Распрацоўшчык праграмы:
Н.Ю. Бярозкіна, дацэнт кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь

Рэкамендавана да зацвярджэння:

кафедрай культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол пасяджэння ад 07.06.2022 № 33

Саветам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол пасяджэння ад 14.06.2022 № 6

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол пасяджэння ад 15.06.2022 № 5

# УВОДЗІНЫ

Вучэбная праграма па дысцыпліне “Бібліятэказнаўства” складзена ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў па спецыяльнасці 2-23 02 71 “Бібліятэказнаўства і бібліяграфія”, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28.09.2020 № 259.

Для вывучэння дысцыпліны “Бібліятэказнаўства” прадугледжана 30 вучэбных гадзін, якія ўключаюць 14 вучэбных гадзін аўдыторных заняткаў (з іх: 12 вучэбных гадзін – лекцыі, 2 вучэбныя гадзіны – круглы стол); 16 вучэбных гадзін – самастойная работа слухачоў.

Дысцыпліна “Бібліятэказнаўства” адносіцца да кампанента тыпавога вучэбнага плана “Агульнапрафесійныя дысцыпліны” і звязана па зместу з праграмай агульнапрафесійнай дысцыпліны “Гісторыя кніжнай культуры Беларусі”.

**Актуальнасць** вучэбнай праграмы абумоўлена неабходнасцю атрымання ведаў па бібліятэчнай справе, фарміравання ўяўлення аб задачах і функцыях бібліятэк.

**Мэта** праграмы: засваенне слухачамі асноў бібліятэчнай справы як дзейнасці, накіраванай на задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей грамадства праз сістэму бібліятэк.

**Задачы** праграмы:

засвоіць асноўныя тэарэтычныя веды ў галіне бібліятэказнаўства;

вызначыць асноўныя перыяды эвалюцыі поглядаў на сутнасць, статус, структуру бібліятэказнаўства;

сфарміраваць уяўленні аб задачах і функцыях бібліятэк розных тыпаў і відаў.

**Метады** навучання: метад аналізу канкрэтных сітуацый, наглядныя і інтэрактыўныя метады і інш.

**Сродкі** навучання: друкаваныя выданні (вучэбныя дапаможнікі, іншыя дыдактычныя матэрыялы); аўдыявізуальныя матэрыялы (слайды, прэзентацыі).

**Форма атрымання адукацыі**: завочная.

**Формы вучэбных заняткаў:** лекцыі, круглы стол.

**Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў**

*Патрабаванні да фарміравання сацыяльна-асабовых кампетэнцый.*

Слухач павінен:

ведаць ідэалогію беларускай дзяржавы, маральныя і прававыя нормы, умець улічваць іх у сваёй прафесійнай дзейнасці;

умець арыентавацца ў працэсах і тэндэнцыях развіцця сучаснага грамадства;

імкнуцца да самаразвіцця, валодаць уменнем самастойна збіраць і аналізаваць інфармацыю;

быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да літаратурнай спадчыны.

*Патрабаванні да фарміравання акадэмічных кампетэнцый.*

Слухач павінен:

ведаць асновы забеспячэння бібліятэчнага, інфармацыйнага і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк згодна з іх патрабаваннямі і інтарэсамі;

умець прымяняць тэарэтычныя веды для рашэння практычных задач.

*Патрабаванні да фарміравання прафесійных кампетэнцый.*

Слухач павінен:

ведаць асноўныя паняцці і тэарэтычныя палажэнні бібліятэказнаўства;

ведаць тэарэтычныя асновы бібліятэказнаўства, звязаныя з вызначэннем функцый, класіфікацыяй і тыпалагізацыяй бібліятэк;

ведаць шматконтурную сутнасную сістэмную мадэль бібліятэкі;

ведаць сутнасць і структуру бібліятэчнай справы;

умець прымяняць базавыя тэарэтычныя веды ў галіне бібліятэказнаўства для вырашэння практычных і навуковых задач бібліятэчнай сферы.

У змест вучэбнай праграмы ўключаны матэрыялы для аўдыторнай работы з прымяненнем актыўных форм навучання і заданні для самастойнай работы.

Кантроль самастойнай работы слухачоў ажыццяўляецца падчас вучэбных заняткаў і бягучай атэстацыі. Пытанні і заданні для самастойнай работы ўключаны ў матэрыялы для бягучай атэстацыі.

# ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

## Раздзел 1 Тэарэтычныя асновы бібліятэказнаўства

### Тэма 1.1 Сутнасць, функцыі і структура бібліятэказнаўства (2 гадзіны, лекцыя)

Дэфініцыя паняцця “бібліятэказнаўства”. Заканамернасці развіцця і асноўныя задачы бібліятэказнаўства. Аб’ект і прадмет бібліятэказнаўства. Характарыстыка поглядаў розных спецыялістаў на аб’ект і прадмет бібліятэказнаўства (А. Ванееў, В. Скварцоў, Ю. Сталяроў, А. Астапаў і інш.).

Структура бібліятэказнаўства як навукі і дысцыпліны. Характарыстыка бібліятэказнаўчых дысцыплін, іх мэты і задачы.

### Тэма 1.2 Бібліятэказнаўства ў сістэме навук (2 гадзіны, лекцыя)

Месца бібліятэказнаўства ў сістэме навук. Эвалюцыя поглядаў на месца бібліятэказнаўства ў сістэме навук. Статус бібліятэказнаўства ў сістэме навуковых ведаў. Гуманітарная накіраванасць і міждысцыплінарны характар бібліятэказнаўства як навуковай дысцыпліны.

Бібліятэказнаўства і дысцыпліны кнігазнаўчага, дакументазнаўчага, бібліяграфазнаўчага і інфармацыйнага цыклаў.

Сувязі бібліятэказнаўства з філасофіяй, сацыялогіяй, псіхалогіяй, педагогікай, эканомікай, менеджментам, культуралогіяй і іншымі навукамі.

## Раздзел 2 Асновы вучэння аб бібліятэцы

### Тэма 2.1 Генезіс і сутнасць бібліятэкі як сацыяльнага інстытута (2 гадзіны, лекцыя)

Бібліятэка як грамадская ўстанова, якая ажыццяўляе збор і захаванне дакументаў з мэтай задавальнення інфармацыйных, культурных, адукацыйных і іншых патрэбнасцей карыстальнікаў. Аб’ектыўныя прычыны ўзнікнення і развіцця бібліятэкі як асобнага сацыяльнага інстытута. Навуковыя канцэпцыі бібліятэкі. Бібліятэка як ідэйна-выхаваўчая, культурна-асветная і навукова-інфармацыйная ўстанова.

Сацыяльная роля бібліятэкі, яе грамадскае прызначэнне. Бібліятэка як сацыяльны інстытут: паняцце, функцыі, атрыбуты сацыяльнага інстытута, характэрныя для бібліятэкі.

Месца і роля бібліятэкі сярод іншых сацыяльных інстытутаў. Уплыў на бібліятэку палітычных, эканамічных, дэмаграфічных, тэхналагічных і іншых фактараў.

Узаемасувязь паняццяў “бібліятэка”, “дакументатэка”, “інфарматэка”, “медыятэка”, “фанатэка”, “відэатэка”, “артатэка” і інш. Электронная (віртуальная) бібліятэка. Сучасныя канцэпцыі бібліятэкі.

**Тэма 2.2 Прынцыпы і фунцыі дзейнасці бібліятэк** (2 гадзіны, лекцыя)

Эвалюцыя поглядаў на прынцыпы дзейнасці бібліятэк. Развіццё поглядаў на прынцыпы дзейнасці бібліятэк у постсавецкі перыяд. Адлюстраванне прынцыпаў дзейнасці бібліятэк у заканадаўстве Рэспублікі Беларусь.

Каштоўнасныя дэтэрмінанты тэорыі прынцыпаў дзейнасці бібліятэк. Групы (узроўні) каштоўнасцей. Прынцып адпаведнасці агульначалавечым каштоўнасцям. Прынцып адпаведнасці нацыянальным каштоўнасцям. Прынцып адпаведнасці каштоўнасцям сацыяльных груп. Прынцып адпаведнасці каштоўнасцям індывіда. Асаблівасці праяўлення палітычных, рэлігійных, этычных, мастацкіх, экалагічных і іншых каштоўнасцей на кожным узроўні.

Эвалюцыя поглядаў на функцыі бібліятэк. Характарыстыка падыходаў да вызначэння функцый бібліятэк у розныя гістарычныя перыяды. Характарыстыка поглядаў на функцыі бібліятэк М. Акілінай, А. Ванеева, Р. Матульскага, К. Селіверставай, А. Сакалова, В. Скварцова і інш. Інфармацыйная і дакументна-камунікатыўная канцэпцыі функцый бібліятэк. Вылучэнне на аснове сістэмнага падыходу сацыяльных і тэхналагічных функцый бібліятэк.

Асноўныя групы функцый. Сутнасныя сацыяльныя функцыі, іх асноўныя рысы. Кумулятыўная, мемарыяльная і камунікатыўная функцыі бібліятэк, іх характарыстыка, узаемасувязі, супярэчнасці. Прыкладныя сацыяльныя функцыі, іх асноўныя рысы. Функцыі забеспячэння адукацыі і выхавання, навукі і вытворчасці, культуры і інш. Навукова-метадычная і навукова-даследчая функцыі. Тэхналагічныя функцыі бібліятэк.

**Тэма 2.3 Бібліятэка як сістэма** (6 гадзін, з іх: 2 гадзіны – лекцыя, 4 гадзіны – самастойная работа)

Выкарыстанне сістэмнага падыходу да вывучэння бібліятэчнай справы. Паняцці “сістэма”, “падсістэма”, “элемент”. Эвалюцыя поглядаў на бібліятэку як сістэму. Аднаэлементная мадэль бібліятэкі (М. Рубакін, А. Пакроўскі, Л. Хаўкіна). Двухэлементная мадэль бібліятэкі (І. Маркаў, А. Чубар’ян). Трохэлементная мадэль бібліятэкі (М. Карташоў, Н. Цюліна, А. Чарняк, І. Фрумін).

Чатырохэлементная мадэль бібліятэкі Ю. Сталярова. Бібліятэка як шматконтурная сістэма.

